# Правілы для адходаў: што робіцца ў краіне, каб вырашыць смеццевую праблему

**Мінулы год быў багаты на навацыі ў сферы абыходжання з адходамі і прадухілення іх утварэння. У красавіку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў дырэктыву № 7 “Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны”, якая ўтым ліку абазначыла неабходнасць поўнай адмовы ад поліэтыленавай упакоўкі і замены яе на экалагічна бяспечную.**

**Была прынятая Канцэпцыя стварэння аб’ектаў па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў і палігонаў для іх захоўвання. Пастановай Савета Міністраў, прынятай у канцы 2019 года, зацверджана забарона з 2021 года выкарыстання і продажу некаторых відаў аднаразовага посуду ва ўстановах грамадскага харчавання і інш.**

**Усе гэтыя напрамкі дзейнасці былі канкрэтызаваныя і ў дакументах, прынятых у пачатку студзеня 2020 года.**

**Якія змены імі прадугледжваюцца?**

**Пашыраная адказнасць**

З 2012 года ў нашай краіне дзейнічае прынцып пашыранай адказнасці вытворцы. Згодназім, вытворцы ці імпар- цёры нясуць адказнасць за абыходжанне са сваімі тавара- мі і ўпакоўкай, калі тыя страцяць спажывецкія якасці і пяройдуць у катэгорыю адходаў.

— У сусветнай практыцы ёсць некалькі спосабаў вы- канання гэтага абавязку, аналагічныя прадугледжаны і ў Беларусі: вытворцы і пастаўшчыкі ствараюць уласную сістэму збору адходаў тавараў і ўпакоўкі ці фінансуюць агульную сістэму збору, — тлумачыць **начальнік упраў-лення на каардынацыі дзейнасці ў сферы абыходжання з другаснымі матэрмяльнмммі рэсурсамі ДУ “Апeратар другасных матэрыяльных рэсурсаў” Анатоль Шагун. —** Усё гэта прапісана ва Указе № 313 “Аб некаторых питаниях абыходжання з адходамі спажывання”, прынятым у 2012 годзе.

Па словах дырзктара ДУ “Алератар другасных матэрыяльных рэсурсаў” Наталлі Грынцэвіч, за час дзеяння дакументу ў краіне ўдалося істотна палепшыць сітуацыю сазборам адходаў тавараў і ўпакоўкі. Так, калі ў 2012 годзе ўзровень выкарыстання адходаў быў 10 %, то за 2019 год ён склаў 22,6 *%.* Аб’ёмы збору адходаў шкла павялічыліся ў тры разы, на 35 *%* — паперы і кардону. Сталі актыўна збіраць палімеры, бытавую тэхніку, шыны, адпрацаванае масла, электрычнае і электроннае абсталяванне, ртуць- утрымліваючыя лямпы, батарэйкі. За кошт чаго гэта было дасягнута?

— Указ № 313 дазваляе эканамічна стымуляваць збор і нарыхтоўку другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), - расказвае Анатоль Шагун. — Сродкі ад вытворцаў і імпарцёраў ідуць на развіццё сістэмы збору ДМР: па- велічэнне колькасці нарыхтоўчых пунктаў, а таксама камненсацыі зборшчыкам; закупку кантэйнераў, тэхнікі, абсталявання для іх падрыхтоўкі і выкарыстання; ства- рэнне вытворчасцяў па сартаванні і перапрацоўцы адходаў, у тым ліку тых відаў, якія раней не перапрацоўваліся.

**Выкарыстоўваць як мага больш адходаў**

З 1 ліпеня 2020 года на змену Указу № 313 прыйдзе новы дакумент — Указ № 16. ад 17.01.2020 г. “Аб удаска- наленні парадку абыходжашЛ з адходамі тавараў і ўпакоўкі”. Што ён зменіць?

— Палажэнні, прапісаныя ў дзеючай рэдакцыі, маюць абмежаваны напрамак дзеяння ў частцы эканамічнага стымулявання збору і перапрацоўкі адходаў. Яны тычац- ца толькі работы з традыцыйнымі ДМР, — тлумачыць Анатоль Шагун. — Збор панеры, шкла, пластыку, шын, бытавой тэхнікі — гэта, безумоўна, важны сегмент, які займае 25-30 % ад усяго аб’ёму цвёрдых камунальных ад- ходаў (ЦКА). Але каб выкарыстоўваць іх на 90-100

%, як у многіх еўрапейскіх краінах, толькі перапрацоўкай ДМР нельга абмежавацца.

У 2017 годзе Урадам была нрынята Нацыянальная стратэгія абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адхо- дамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі на нерыяд да 2035 года. Яна ўлічвае як традыцыйныя, так і новыя на- прамкі — энергстычнае выкарыстанне і апрацоўку ар- ганічнай часткі ЦКА. Каб мець магчымасць эканамічна стымуляваць і гэтыя кірункі, і былі ўнесены адпаведныя змены ў заканадаўства.

**Пластыку — бой!**

За апошнія дзесяцігоддзі пластык захапіў рынак тавараў і ўпакоўкі, а пластыкавыя адходы сталі адным з галоўных забруджвальнікаў наваколля — ад сушы да Сусветнага акіяну. Каб зменшыць яго ўплыў, быў прыняты План мерапрыемстваў, накіраваных на паэтапнае зніжэнне выкарыстання палімернай унакоўкі з яе замяшчэннем на экалагічна бяспечную — на аснове паперы, шкла, кардону і біяраскладальнага пластыку. Ён быў зацверджаны Пастановай Савета Міністраў № 7 ад 13.01.2020 г.

— Усе мерапрыемствы Плану можна ўмоўна падзяліць на пяць блокаў, — расказвае **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Вадзім Дэмко.** — Гэта вытворчасць і выкарыстанне экалагічна бя- спечнай упакоўкі, у тым ліку біяраскладальнай; навуковыя даследаванні па вызначэнні найбольш перспектыўных, экалагічна і эканамічна мэтазгодных тэхналогій атрыман- ня бяспечнай упакоўкі, якія дазваляюць захаваць якасныя характарыстыкі і тэрміны прыдатнасці прадукцыі; тэхніч- нае рэгуляванне, скарачэнне імпарту і вытворчасці палі- мернай упакоўкі; удасканаленне сістэмы абыходжання з адходамі, у тым ліку арганізацыя паасобнага збору ДМР і. і нфармацыйнаасветніцкая работа.

**Ад палігонаў — да рэгіянальных цэнтраў**

У краіне плануецца стварыць аб'екты па сартаванні і выкарыстанні ЦКА і палігоны для іх захоўвання. Адпа- ведная Канцэпцыя была прынята ў кастрычніку 2019 года Пастановай Саўміну № 715. Так, прадугледжваецца завяршыць пераход ад раённых сістэм кіравання адходамі да рэгіянальнага ўзроўню. Будуць створаны 28 цэнтраў, куды пачнуць звозіць камунальныя адходы і сартаваць іх для вымання прыдатных ДМР. Там жа пабудуюць пляцоўкі для кампаставання і падрыхтоўкі адходаў для энергстычнага выкарыстання, перапрацоўкі буйнагарабарытных і будаўнічых адходаў. Усё ж астатняе, што нельга пусціць у грамадзянскі абарот, будзе захоўвацца на палігонах, створаных паблізу.

Па словах **міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандра Церахава,** узровень выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў да 2030 года можа вырасці да 66 *%.* Нагадаем, што ў Стратэгіі адпаведны паказчык быў запланаваны да гэтага тэрміну на ўзроўні 50 *%.*

**Новае жыццё для бутэлькі**

Не пазней 2022 года ў нашай краіне плануюць укараніць дэпазітную (залогавую) сістэму абарачэння спажывецкай упакоўкі. Адпаведны праект Указу цяпер знаходзіцца на разглядзе ў Адмініграцыі Прэзідэнта. Гэтая сістэма будзе распаўсюджвацца на ўсё, у што сёння разліваюцца напоі, — ПЭТ-бутэлькі, шкляныя бутэлькі і слоікі, бляшанкі, за выключэннем малочнай тары. Астатнія віды ўпаковак застануцца ў сістэме паасобнага збору.

— Залоговая сістэма падобная да той, што была ў Савецкім Саюзе, — кажа Анаголь Шагун. — Набываючы напой, пакупнік пакідае ў краме залог за бутэльку (плануецца, што ён складзе 20 капеек. — Заўв. рэд.). Здаўшы ўжо пустую тару ў гэтай жа ці іншай краме, ён вяртае сабе залог. Такая сістэма дазволіць як мінімум у два разы павялічыць аб’ёмы збіраемай тары ў рэспубліцы. Плануецца, што яна дасць не менш за 80 % звароту.

**Навошта павышаюць збор?**

Каб вытворцы пераходзілі на “зялёны” бок і адмаўляліся ад выкарыстання пластыку ва ўпакоўцы, важна не толькі забараняць, але і эканамічна стымуляваць іх да вы- карыстання альтэрнатыўных матэрыялаў, упэўнены Анатоль Шагун. Тэта прадугледжваюць і нормы Указу № 16. Згодна з імі, каб не плаціць збор, трэба пашыраць у вытворчасці палімернай

упакоўкі і вырабаў з пластмас выкарыстанне пластыкавых адходаў. На сёння іх доля павінна складаць не менш за 30 %, з 2021 года — да 35 %, а з 2023-га - 40 %.

— Яшчэ адна мэта Указу, якая атрымае сваё развіццё ўжо ў дакументах У раду, — зрабіць так, каб бізнес больш актыўна пераходзіў ад прынцыпу “заплаціў і забыўся” да стварэння ўласных кааперацыйных сістэм збору адходаў упакоўкі, без выплаты кампенсацыі, — гаворыць спецыяліст. — Дзякуючы гэтаму можна павялічыць аб емы збору пластыку, дробнай бытавой тэхнікі і інш.

Прастымуляваць гакія змсны прызначана і павышэнне памераў платы за карыстанне пласты кавай упакоўкай, прадугледжанае пастановай Саўміну № 24 ад 16.01.2020 г. Яна будзе павялічвацца паэтапна: са 180 да 270 рублёў з 1 красавіка 2020 года і да 360 рублёў з 1 студзеня 2021 года. У сваю чаргу плануецца напалову (да 90 рублёў з 01.04.2020 г.) знізіць плату за выкарыстанне біяраскла- дальнай упакоўкі, выrабленай з раслiннай сыравіны.

Пры гэтым, па словах Анатоля Шагуна, чакаецца, што павышэнне платы ў два разы не прывядзе да істотнага павелічэння кошту тавараў. Так, сёння збор за адну ПЭТ-бутэльку, якая важыць каля 40 г, складае 0,7 капеек у цане тавару. Пры павелічэнні збору да 360 рублёў яна стане адпаведна 1,4 капеек.

***

Усе гэтыя меры, што прадпрымаюцца ў краіне па ўдасканаленні сістэмы збору адходаў і прадухіленні іх утварэння, не будуць дзейснымі без актыўнага ўдзелу ў “без- адходнай” кампаніі насельніцтва, упэўнены спецыялісты. Пры гэтым людзям не трэба пераварочваць горы смецця — дастаткова выкідваць ДМР і змяшаныя адходы ў асобныя кантэйнеры, як і небясiечныя для прыроды батарэйкі і люмінесцэнтныя лямны; адмаўляцца ад аднаразовай палімернай упакоўкі на карысць шматразовай і старацца падаўжаць жыццё тых рэчаў, якія ўжо выкарыстоўваюц- ца ў гасгшдарцы.

Вераніка КОЛАСАВА

**Источник:** Родная прырода. – 2020. – № 2. – С. 2–4.